*Таццяна Лук’янава*

# ФАЛЬКЛОР ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ

Узровень нацыянальнай самасвядомасці сучасных беларускіх школьнікаў залежыць ад многіх фактараў. Сярод іх асаблівае значэнне мае духоўная сувязь (ці хаця б знаёмства) з багатай традыцыйнай культурай беларусаў, таму што фальклор з’яўляецца формай самаўсведамлення, самасцвярджэння, самавыяўлення народа.

Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускіх школьнікаў адбываецца ў складаных умовах, якія ўзмацняюцца нестандартнай, у параўнанні з іншымі краінамі СНД, моўнай сітуацыяй у Беларусі, адчувальнай для усіх яе жыхароў, і, у першую чаргу, для школьнікаў.

Акрамя таго, умовы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці не аднолькавыя для вясковых школьнікаў і гарадскіх, таму што дзеці знаходзяцца ў розным культурным асяроддзі. Калі беларуская вёска захавала фальклор ва ўсім багацці яго жанраў як сваё натуральнае культурнае асяроддзе, і школьнікі далучаюцца да народных традыцый непасрэдна праз сям’ю і соцыум, то горад, нягледзячы на абазначаную ў апошнія гады тэндэнцыю да адраджэння традыцый народных свят, такой магчымасці не дае. Ды і сістэма жанраў жывога гарадскога фальклору істотна адрозніваецца ад традыцыйнай, прычым яго творы бытуюць выключна на рускай мове (так званыя дваровыя песні, анекдоты, дзіцячы фальклор і інш.). Хутчэй можна гаварыць пра агрэсіўны напад на нясталую свядомасць падлеткаў «шэдэўраў» масавай культуры, поп-музыкі, рытмаў замежнай эстрады, чым пра станоўчы і актыўны ўплыў нацыянальных традыцый.

Для жыхароў нашай краіны, і школьнікаў у тым ліку, характэрна дакладная этнічная самаідэнтыфікацыя. Гэта гаворыць пра тое, што нацыянальная самасвядомасць не разбурана. Але, калі гаворка заходзіць пра родную мову, сітуацыя мяняецца. Добра ўсведамляючы, што родная мова беларусаў усё ж такі беларуская, а не руская, на індывідуальным узроўні большасць гараджан (каля 95%) размаўляюць па-руску. Больш за тое, многія гараджане сумняваюцца ў тым, што беларусы захавалі чыстую беларускую мову, наіўна мяркуючы, што самі яны гавораць па-руску (хаця на самай справе выкарыстоўваюць нацыялект, г. зн. мясцовую разнавіднасць рускай мовы), а вясковыя жыхары – незразумела на якой, але не на «чыстай» беларускай мове.

Лінгвісты пераканаўча даказалі, што «чыстая мова» – звычайны абывацельскі міф. На Беларусі не існуе ні «чыстай» беларускай мовы, ні «чыстай» рускай. Як і ў іншых краінах СНД, у Беларусі ёсць унармаваная літаратурная мова, і ёсць жывыя дыялекты беларускай мовы. Літаратурная мова – гэта мова інтэлігенцыі, навуковых прац, газет, радыё, тэлебачання, а не вясковых жыхароў. Вясковыя жыхары традыцыйна карыстаюцца мясцовымі гаворкамі. Канешне ж яны адчуваюць уплыў мовы гараджан, але гэты факт зусім не значыць, што беларуская мова знікла ці змянілася непазнавальна. Больш за тое, менавіта на гэтай мове, а дакладней на яе жывых гаворках, існуе і дагэтуль такі моцны пласт слоўнай культуры, як фальклор, які і з’яўляецца жывым сведчаннем існавання самастойнай беларускай мовы.

Паколькі Беларусь адзіная сярод краін СНД вылучаецца нетыповасцю моўнай свядомасці, гэта значыць, што нам трэба шукаць адметныя шляхі фарміравання, умацавання і абароны нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў. І адным з такіх шляхоў з’яўляецца зварот да скарбніцы фальклору, актыўнае яго ўключэнне ў працэс адукацыі і выхавання дзяцей.

Народная творчасць на працягу многіх стагоддзяў з’яўлялася глабальнай культурнай сферай жыцця беларусаў. Фальклор – адметная духоўная сістэма, якая не толькі адлюстравала істотныя рысы нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, але і актыўна паўплывала на фарміраванне нацыянальнага характару, увабраўшы ў сябе ідэі, вобразы, пачуцці, узоры бытавых і абрадавых паводзін і г. д. Фальклор існуе і можа існаваць толькі на нацыянальнай мове. Пры перакладзе фальклорных тэкстаў на іншую мову, яны губляюць шэраг сваіх важнейшых якасцей, а многія этнічныя дэталі ўвогуле не паддаюцца перакладу.

Фальклор валодае багатым патэнцыялам для фарміравання і развіцця нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў. Вясковыя дзеці ў гэтым плане выйграюць, таму што вёска ў поўнай меры з’яўляецца носьбітам традыцыйнай народнай культуры, чаго нельга сказаць пра горад. Горад звязаны з традыцыйнай народнай культурай у асноўным праз сродкі масавай інфармацыі, але іх магчымасці абмежаваныя. СМІ не здольны запоўніць тую духоўную нішу, якая прызначана для народнай культуры. І тут выключнае значэнне мае работа школы. Менавіта школа павінна ўзяць на сябе абавязак далучэння дзяцей да народных традыцый. Бо тое, што закладзена з дзяцінства, застаецца ў чалавека назаўсёды.

Відавочна, што гэты працэс не можа адбывацца спантанна, а павінен забяспечвацца камплектам спецыяльных адукацыйных і выхаваўчых праграм. У апошнія гады ў гарадах амаль цалкам адмовіліся ад школ з выкладаннем па-беларуску, захаваўшы дзе-нідзе асобныя беларускамоўныя класы, што патрабуе пошуку альтэрнатыўнага тыпу школы. У якасці выйсце можа быць так званая «этнашкола».

Тэрмін «этнашкола» з’явіўся як назва эксперыментальнай педагагічнай пляцоўкі, адобранай Экспертнай камісіяй Міністэрства адукацыі, на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Аўтарам і навуковым кіраўніком праекта выступіў дацэнт Беларускага ўніверсітэта культуры, кандыдат мастацтвазнаўства І. І. Сучкоў. У далейшым «этнашколай» таксама сталі называць і новы тып школы, якая якраз і мае на ўвазе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўключэнне ў адукацыйна-выхаваўчую праграму беларускага фальклору, актыўнае яго ўжыванне ва ўсіх класах і практычна ва ўсіх школьных прадметах.

Трэба адзначыць, што ўжо існуе праграмнае забеспячэнне і метадычныя матэрыялы для так званай «этнашколы», распрацоўкі ў галіне практычнага прымянення фальклорных матэрыялаў у школе. Выдадзена некалькі дапаможнікаў для настаўнікаў (напрыклад, «Беларускі фальклор у школе»).

Навукова-даследчы калектыў пад кіраўніцтвам І. І. Сучкова распрацаваў спецыяльную праграму, якая прапаноўвае ў пачатковай школе пазнаёміць вучняў з такімі элементамі этнічнай культуры, як беларускі земляробчы каляндар, фальклорныя святы. У 5–7-х класах – з сямейнымі абрадамі. У склад прадмета «Музыка» прапанавана ўвесці музычны фальклор, а ў 8–9-х класах – новы курс пад назвай «Традыцыйная
і сучасная культура Беларусі», які б спрыяў засваенню вучнямі рэгіянальных асаблівасцей паэтыкі і эстэтыкі фальклору.

Распрацаваны спецыяльныя заняткі і практыкаванні для выкарыстання фальклору на ўроках беларускай мовы, матэматыкі, фізкультуры, якія ўлічваюць задачу ўсебаковага развіцця асобы дзіця (выпрацоўка арганізаванасці і ўвагі, развіццё творчай фантазіі, здольнасці да імправізацыі, сенсітыўнага ўспрымання, хуткасці рэакцыі, спрыту, трэнінг зрокавых і слыхавых аналізатараў, развіццё пачуцця рытму і тэмпу, работа над голасам, дыханнем, дыкцыяй і шмат іншага).

Гэтыя метадычныя напрацоўкі можна выкарыстоўваць і ў звычайнай агульнаадукацыйнай школе, і ў школах з музычным, тэатральным, эстэтычным ухіламі, як для падрыхтоўкі ўрокаў па асноўных прадметах, так і для правядзення заняткаў па выбары (напрыклад, «Асновы тэатральнай дзейнасці», «Асновы культуры маўлення» і інш.).

Аўтары ўпэўнены, што такая праграма навучання ў школе паспрыяе развіццю не толькі нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў, але і патрыятызму. Бо толькі адчуўшы і ўсвядоміўшы прыгажосць і, галоўнае, арыгінальнасць, непаўторнасць мясцовых паданняў і балад, танцаў і замоў, можна па-сапраўднаму палюбіць горад ці вёску. Толькі ўсвядоміўшы, што прыгажосць не абавязкова за морам, але і побач, вакол цябе, можна любіць сваіх бацькоў і дзядоў, суседзяў, паважаць іх быт, жыццё і працу.

Такім чынам, пытанні нацыянальнай школы, далучэння маладога пакалення да традыцыйнай народнай культуры патрабуюць пільнай увагі да сябе як з боку дзяржавы, так і ўсіх тых, каму не абыякава праблема захавання і ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ